Кавалеўскі, С. Зялёны падарунак нашчадкам / С. Кавалеўскі // Витебские вести. – 2016. – 19 янв. – С. 5.

## ЗЯЛЁНЫ ПАДАРУНАК НАШЧАДКАМ




**Парк графа Дзеражынскага ў сучасным аграгарадку Межава Аршанскага раёна закладзены ў 1901 годзе і зараз лічыцца адным з найпрыгажэйшых у рэгіёне. У 1989 годзе ў зборніку «Садова-паркавае мастацтва Беларусі» яго апісаў вядомы навуковец Анатоль Федарук.**

Канешне, цяпер ад парку засталіся толькі фрагменты. Але на некалькіх гектарах з пачатку мінулага стагоддзя працягваюць радавацьвока каля сотні дрэў, у тым ліку экзатычных для нашых мясцін: лістоўніцы, сосны Веймутава, Банкса, Мурэя, чорная бяроза і інш. Па словах старшыні Межаўскага сельсавета Мікалая Баркоўскага, раней на майскія святы мясцовая гаспадарка праводзіла тут культурна-масавыя мерапрыемствы для сваіх работнікаў і жыхароў пасёлка. У парку ёсць вайсковае пахаванне, дзе знайшлі вечны спачын 136 савецкіх салдат і партызан, якія загінулі пры вызваленні Аршаншчыны падчас вайны. На 9 Мая сюды з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Арэнбурга, Краснаярска прыязджаюць сваякі загінуўшых.

Парк размешчаны на паўвостраве, які акаляе перакрытая дамбай рака Скуння і яе прыток ручай Варанец. У штучным вадаёме ёсць шчупакі, акуні, плятва, карасі, таму зімой і летам ён папулярны сярод мясцовых і прыезджых рыбакоў. Кожны дзень па колішняй панскай дарожцы і масток праз Варанец цераз графскі парк вучні ідуць у школу, якая знаходзіцца побач з векавымі дрэвамі.

Межаўскі парк, якому сёлета споўніцца 115 гадоў, з'яўляецца помнікам прыроды мясцовага значэння.

**Сяргей КАВАЛЕЎСКІ.**
**Фота Антона СЦЕПАНІШЧАВА.**